

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№4 (242) 24 — 30 СТУДЗЕНЯ 2002Г. НАКЛАД 11.500 ЭКЗ. КОШТ 220 РУБ.

НАВІНЫ

КІРАВАЦЬ СЛОНІМШЧЫНАЙ БУДЗЕ НОВЫ ЧАЛАВЕК

Як стала вядома карэспандэнту "ГС", кіраўніцтва Гродзенскай вобласці вызначылася з кандыдатам на пасаду старшыні аб'яднанага выканкама Слоніма і раёна.

Па словах дасведчаных людзей, на зацвярджэнне прэзідэнту ў якасці кіраўніка Слонімшчыны будзе прадстаўлены Мечыслаў Браніслававіч Касцюк, які да гэтага працаваў старшынёй камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню аблвыканкама.

Мечыславу Браніслававічу 50 гадоў, ён нарадзіўся ў вёсцы Саваздзякі Дзятлаўскага раёна. Пасля заканчэння мясцовай школы працаваў на заводзе "Чырвоны металіст", што ў Стаўрапольскім краі. Там жа скончыў сельскагаспадарчы інстытут і атрымаў вышэйшую адукацыю. Потым працаваў аграномам у калгасе "Чырвоны партызан" Дзятлаўскага раёна, служыў у войску, доўгі час знаходзіўся на камсамольскай і партыйнай рабоце. Пэўны час быў старшынёй Дзятлаўскага выканаўчага камітэта. Па словах людзей, якія яго блізка ведаюць, Мечыслаў Касцюк — адукаваны, кампетэнтны і добрапрыстойны чалавек.

Адначасова тыя ж крыніцы інфармацыі сцвярджаюць, што пакуль невядома, якая будзе структура і штатная колькасць служачых аб'яднанага выканкама новастворанай адміністрацыйнай адзінкі. Але многія начальнікі ўжо падшукваюць сабе працу. Напрыклад, Алег Мікалаевіч Лакцюшын, цяперашні старшыня гарвыканкама, плануе заняць крэсла дырэктара хлебазавода, Анатоль Васільевіч Бялянін, ягоны намеснік, разлічвае на пасаду дырэктара прафтэхвучылішча №129 тэкстыльшчыкаў і г.д. Многіх чыноўнікаў, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, праводзяць на заслужаны адпачынак.

Невядома, які лёс чакае старшыню райвыканкама Мікалая Аляксандравіча Пахолка. Нядаўна яму была зроблена аперацыя на пазваночнік, і цяпер ён знаходзіцца на бюлетні.

Анатоль МІРСКІ

20 000 РУБЛЕЙ = 12 ДОЛЛАРАМ

21 января в Беларуси введена в обращение банкнота достоинством 20 тысяч рублей образца 2000 года.

Банкнота достоинством 20 тысяч рублей (в пересчете около 12 долларов США) изготовлена на специальной высококачественной бумаге с оттенком оливкового цвета с защитными волокнами, локальным водяным знаком и защитной нитью. Размер банкноты — 150x74 мм.

Преобладающие цвета лицевой стороны — темно-серый и зеленый. Сюжет основного изображения лицевой стороны банкноты — дворец Румянцевых и Паскевичей в Гомеле. В левом нижнем углу банкноты расположен рельефный код обозначения номинала билета для людей с ослабленным зрением.

БелаПАН

МЯСАКАМБІНАТ ПАЧАСТАВАЎ ПАКУПНІКОЎ КАЎБАСАМІ



Фота Віталя ГІЛЯ

У мінулыя панядзелак і аўторак наведвальнікаў некаторых слонімскіх магазінаў мясцовы мясакамбінат частаваў сваёй прадукцыяй.

Не, гэта была не раздача бясплатных абедаў для маламаёмых, бо такога ў нас яшчэ пакуль няма. Гэта была дэгустацыя. Слова новае ў нашым лексіконе.

Магчыма, жыхары беларускай сталіцы ці абласных цэнтраў і прызвычаіліся да ўсялякага роду прэзентацый ды дэгустацый, а вось у нас, у глыбінцы, гэта — справа малазнаёмая. Тым не менш, адным з першых у Слоніме такім чынам пачаў рэкламаваць сваю прадукцыю мясакамбінат. Як адзначылі слонімцы, хто меў магчымасць з'есці не адну міску каўбас, гэтае мерапрыемства атрымалася на выдатна. Дэгустацыя прайшла ў магазінах "Лета", "Дружба", "Верасок" і "Салют". Частавалі пакупнікоў каўбасамі ды мяснымі кансервамі самадзейныя артысты, працаўнікі камбіната. Адначасова яны весялілі людзей прыпеўкамі пад гармонік.

Валерый КАВАЛЕНКА

ФЕСТЫВАЛЬ НЕЗАЛЕЖНАЙ ПРЭСЫ



Фота Віталя ГІЛЯ

Беларускі палітык Станіслаў Шушкевіч на фестывалі незалежнай прэсы ў Мінску зацікавіўся "Газетай Слонімскай". Пасля гутаркі са слонімскімі журналістамі, ён паабяцаў у бліжэйшы час наведаць горад над Шчарай і сустрэцца з яго жыхарамі.

Станіслаў Станіслававіч запытаўся, ці адчуваем мы сябе незалежнымі? На што пачуў адказ, што свабода прэсы — гэта суб'ектыўная рэальнасць, і ў большай ступені яна залежыць ад саміх журналістаў.

Працяг на 2-ой стар.

ГРАМАДСКАЯ ПРАВААБАРОНЧАЯ ПРЫЁМНАЯ

вядзе прыём грамадзян па суботах з 9[00] да 13[00].

Тэл. 2-54-17.

АфішА

Кінатэатр "МІР"

24 студзеня "Дзённае святло".

25 студзеня "Тыдзень старшакласнікаў".

26 студзеня "Браты".

27 студзеня "Апошняя бітва".

28 студзеня "Жыць і памерці са шпагаю".

Сеансы ў **15, 17, 19, 21.**

Драмтэатр

27 студзеня

"Залатое кураня". (для дзяцей)

Пачатак у 12 гадзін.

"Непаразуменне".

Пачатак у 17 гадзін.

НАВІНЫ

УЗРАСЛІ КАМАНДЗІРОВАЧНЫЯ

На Беларусі павысіліся камандзіровачныя кампенсацыі.

Цяпер за кожныя суткі камандзіроўкі павінна будзе налічвацца 3 500 рублёў (раней — 2 500). Кампенсацыя за аднадзённую камандзіроўку ўзрасла да 1 750 рублёў замест былых 1 250, за ноч на прыватнай кватэры — да 1 050 рублёў з 750-ці.

Валерый КАВАЛЕНКА

ВЫСТАВА СТАРЫХ ПАШТОВАК І ПЛАКАТАЎ

У Слонімскім краязнаўчым музеі адкрылася выстава "Помнікі культавай архітэктуры на старых паштоўках і плакатах".

На іх адлюстраваны помнікі культавай архітэктуры Слоніма, Гродна і іншых гарадоў Беларусі. Выстаўка працягнецца да канца студзеня.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЧТО МЫ ЛЮБИМ

В ассортименте Слонимского хлебозавода на сегодняшний день насчитывается 72 вида кондитерских, хлебобулочных изделий.

Особой популярностью у слонимчан, по словам начальника производственно-технической лабораторией предприятия Татьяны Хуботовой, пользуется пирог "Именинный", булки "Оригинальная", "Минская", "Чараўніца", "Орхидея", багет "Минский" с ванилью, хлеб "Калинковичский", "Могилевский".

Ольга ШИНКЕВИЧ

Цены на Слонимском рынке по состоянию на 22 января 2002г.

Продукт	Цена за кг
Гранаты	2500
Бананы	1600
Апельсины	1700
Яблоки	600 — 2000
Киви	450 (за штуку)
Помидоры	3500
Капуста	450
Морковь	500
Лук	700
Чеснок	2000 — 2200
Картофель	220 — 250
Молоко	350 (л.)
Творог	900 — 1000
Масло	3200
Яйца	1500 — 1700
Свинина	3500 — 6000
Говядина	4500 — 6000
Баранина	4000 — 5000
Сало соленое и свежее	3500 — 4000
Телятина	4500 — 6500
Мед	5300 — 5500
Сметана	1200 — 1500
Лимоны	2000
Мандарины	2200

Курсы обмена валют в г.Слониме по состоянию на 22 января 2002г.

"Приорбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1670	1700
1 EURO	1420	1490
1 RUR	52	55
"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1672	1682
1 EURO	1445	1490
1 RUR	53	55
ОАО "Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1640	1682
1 EURO	1410	1485
1 RUR	53	55
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1660	1680
1 EURO	1430	1470
1 RUR	53	55
Нацбанк РБ		
1 EURO	1434.66	

СВЯТА

ФЕСТЫВАЛЬ НЕЗАЛЕЖНАЙ ПРЭСЫ

18 студзеня ў Рэспубліканскім палацы культуры ветэранаў у Мінску адбыўся Другі беларускі фестываль недзяржаўнай прэсы, які быў арганізаваны Беларускай асацыяцыяй журналістаў сумесна з Прадстаўніцтвам Савета па міжнародных даследаваннях і абменах "IREX" ЗША і Фондам падтрымкі рэгіянальнай прэсы.

У фестывалі прынялі ўдзел каля 50 недзяржаўных газет Беларусі. Сярод іх была і наша "Газета Слонімская", якая па тыражу сёння сярод рэгіянальных газет Беларусі займае пятае месца. А згодна даследаванняў, якія праводзіла IREX\ProMedia, "ГС" на Слонімшчыне чытаюць 87% дарослага насельніцтва. Удзельнікі фестывалю не толькі змаглі пазнаёміць прысутных са сваім выданнем, але і мелі добрую магчымасць абмяняцца думкамі і прапановамі сярод сваіх калег, сустрэцца з вядомымі беларускімі палітыкамі, літаратарамі, мастакамі і музыкантамі. Як і на любым фестывалі, не абышлося без падарункаў і прызоў. Напрыклад, рэдактар "ГС" Віктар Валадашчук атрымаў каштоўны падарунак "За вернасць прэсе". А наш зямляк, мастак і журналіст Алег Карповіч, які працуе ў газеце "Свабодные новости плюс", быў узнагароджаны двойчы.

Другі фестываль незалежнай прэсы яшчэ раз даказаў, што свабода слова, друку і інфармацыі ў Беларусі ўсё ж ёсць. І будучыня — за дэмакратычнай прэсай.

Сяргей ЧЫГРЫН



Фота Віталя ГІЛЯ



Фота Віталя ГІЛЯ

На здымках: удзельнікам другога фестывалю незалежнай прэсы Беларусі было цесна ў фае мінскага палаца культуры ветэранаў

ПРОБЛЕМА

НЕ ДОСТУЧАТЬСЯ...

Для того, чтобы "достучаться" к чиновникам с какой-либо проблемой, уходит слишком много времени. В этом смогли убедиться несколько семей из деревни Жировичи Слонимского района.

Вот уже три года семьи Сергеевых, Мороз и Лебёдко ждут, когда же наконец будет тепло в их квартирах. Эти люди проживают в Жировичах по ул. Молодежной, 18 вот уже 13 лет.

"Планировка комнат в квартирах очень хорошая, но зимой мы замерзаем, — говорится в письме, пришедшем на адрес "Газеты Слонімскай". — Температура воздуха в комнатах выше 16 градусов не поднимается. В зале и в спальне батареи совсем холодные, там только 11-13 градусов тепла. А весной тает снег на крыше, заливает всю стену в зале, летом после дождей по ведру воды приходится из дома выносить. Из-за сырости обвисли обои, почернели стены", — жалуются люди.

Для того, чтобы хоть как-то обратить на себя внимание, жители 18-го дома неоднократно обращались в ЖКХ к начальнику Николаю Кроту, писали заявление в райисполком и получили ответ за подписью заместителя председателя райисполкома Ивана Бабяка, что дом поставлен на контроль.

Однако, как следует из письма, на жалобы никто из чиновников не отреагировал. "Правда, несколько лет назад переделали подачу воды в детских комнатах, поэтому там температура воздуха при закрытых дверях сохраняется до 15-16 градусов", — говорится в письме. "Приходила комиссия, смотрела батареи, измерила температуру воздуха в квартирах, обещала снизить на 50% оплату за отопление, но все это так на словах и осталось".

В телефонном разговоре с корреспондентом "ГС" Вера Ивановна Сергеева сказала, что после того, как они еще раз отправили письмо с жалобой в райисполком, почти ничего не изменилось. "Я болею уже где-то с 23 декабря и по сей день. При такой температуре воздуха в квартире боюсь, что не выздоровею до весны", — сказала женщина. Вера Ивановна работает продавцом в Жировичах. Зарплата у нее маленькая, около 40 тысяч рублей в месяц, поэтому выкладывать около 14 тысяч рублей за такое "отопление" у нее нет возможности.

Для того, чтобы добиться правды, женщина в очередной раз обратилась в ЖКХ. По словам Веры Ивановны, ей там ответили: "А вы пишите много жалоб. Мы ваши бумаги будем использовать по прямому назначению...". "Как же так с людьми можно разговаривать?" — возмущается женщина.

Еще Антон Чехов когда-то отметил: кому чужда жизнь, кто не способен к ней, тому больше ничего не остается, как стать чиновником. С тех времен, к сожалению, так ничего и не изменилось.

Начальник жилищно-коммунального хозяйства Николай Крот прокомментировал ситуацию с домом по Молодежной улице так: "У нас нет средств на ремонт этих квартир. Это не в наших силах. А что касается отопления этих квартир, то нужно составить акты. И если температура воздуха будет ниже 18 градусов, то за отопление надо будет платить меньше".

Ольга ШИНКЕВИЧ

КТО ВОЗЬМЕТ БИЛЕТОВ ПАЧКУ, ТОТ ПОЛУЧИТ...



Фота Віталя ГІЛЯ

4000 лотерейных билетов "Городница-2", стоимостью 1500 рублей каждый, было получено для продажи жителям Слонима.

На сегодняшний день, по словам заведующей финансовым отделом местного горисполкома Тамары Хворик, продано примерно около половины от всего полученного количества.

Лотерейные билеты продаются почти во всех магазинах, а также на всех предприятиях города.

Какие только методы организации не предпринимают, чтобы быстрее сбыть "Городницу-2". Ну, например, в стоимость заказанного столика на празднование Нового года в одном кафе включили еще и лотерейный билет. Вот только людей почему-то заранее не предупредили об этом.

На одном предприятии Слонима люди тянули жребий. Кому "повезло", тому и досталась "Городница-2". Пока еще в промышленных и продовольственных магазинах в стоимость купленного товара лотерею "Городница-2" не включают.

В любом случае, обладатели лотерейных билетов, приобретенных по собственному желанию или по добровольно-принудительному, будут участвовать в розыгрыше ценных призов, который состоится 26 января 2002 года. Хочется надеяться, что многим из них повезет.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗДАРЭННІ

НА СТАРОГА – З ПІСТАЛЕТАМ

Слонімская міліцыя затрымала 35-гадовага, раней судзімага не мясцовага жыхара, які абвінавачваецца ў рабаўніцтве.

У мінулую пятніцу, 18 студзеня, ён уварваўся ў хату 77-гадовага жыхара вёскі Азярніца, наставіў пісталет і запатрабаваў ад старога грошай. Але якое ў сталага чалавека багацце?

Рабаўнік збіў гаспадара і забраў тры бутэлькі віна, пяць пачак цыгарэт, 20 тысяч рублёў, пасля чаго знік. Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа, вядзецца следства.

У ГАРАЖ ТРАПІЛІ ПРАЗ ДАХ

У ноч на 21 студзеня невядомыя ўгналі "Фальксваген-Пасат" прама з гаража, які знаходзіцца на тэрыторыі кааператыва "Заазёрны".

Злачынцы разабралі дах гаража, такім чынам трапілі ў памяшканне і ўкралі іншамарку.

Валодзя ЯНЧУК

ЗГВАЛТАВАЎ ДЗЯЎЧЫНУ

Супрацоўнікі Слонімскай міліцыі затрымалі гвалтаўніка.

Ім аказаўся слесар адной са слонімскіх прыватных станцый тэхнічнага абслугоўвання. У салоне аўтамашыны ён згвалтаваў 17-гадовую дзяўчыну.

Сяргей ЧЫГРЫН

УЧАДЗЕЛІ Ў КВАТЭРЫ БЕЗ КОМІНА

У мінулую суботу ў прыёмны пакой раённай бальніцы з дыягназам "атручванне чадным газам" паступілі тры чалавекі з вуліцы Даватара.

З іх двое дарослых — Ігар Маруцька і Галіна Ганчарык, і школьнік Аляксандр Ганчарык.

Хлопчык у цяжкім стане адразу быў змешчаны ў рэанімацыю, але ўжо на наступны дзень яго перавялі ў тэрапеўтычнае аддзяленне. Зараз пагрозы яго здароўю няма.

Як паведамілі карэспандэнту "ГС" у аварыйнай службе гаргаза, учадзелі людзі ў выніку карыстання газавым катлом у памяшканні без дастатковай цягі. Акрамя таго, былі зачынены форткі.

Валерый КАВАЛЕНКА

НОВОСТИ

КОММУНИСТЫ ОТМЕТИЛИ ОЧЕРЕДНУЮ ГОДОВЩИНУ СМЕРТИ ЛЕНИНА



Возложение венков у памятника В.И. Ленина

21 января коммунисты Слонима, как и всей Беларуси, отметили очередную годовщину со дня смерти вождя мирового пролетариата, основателя СССР Владимира Ульянова (Ленина).

В связи с этой датой были возложены цветы к памятнику вождя в центре города.

Виктор ГЕРАСИМЧИК, фото Виталия ГИЛЯ

РЕЗОНАНС

ТРОНУЛСЯ ЛЕД ОБЕЩАНИЙ

В №45 (231) от 8 ноября 2001 года "ГС" рассказала своим читателям о жилищной проблеме жительницы Слонима Натальи Шейнюк в статье "Нужна помощь, а не обещания". Похоже, дело, наконец-то, сдвинулось с мертвой точки.

Напомним, что в ноябре прошлого года Наталья Шейнюк направила письменные обращения с просьбой о помощи в администрацию Президента Беларуси, в министерство социальной защиты, председателю Гродненского облисполкома и в Слонимский горисполком. Как ни странно, первым пришел ответ из министерства. Правда, вразумительным ответом этот официальный документ можно назвать с большой натяжкой. Было это обычной чиновничьей отпиской с изложением причин, почему семье Шейнюк не положено бесплатное государственное жилье. Все объяснялось дотошно правильно, но вот как же все-таки решить проблему — об этом ни слова.

Чуть позже последовали столь же малопригодные для реального решения жилищного вопроса ответы из облисполкома и почему-то из облгаза. Президент же со всей своей администрацией и городские власти Слонима молчали. Видимо, вертикаль власти не ведет переписку с гражданами Беларуси и оставляет за собой право письма и обращения не замечать и не возвращать. А ведь есть Закон об обращениях граждан, в котором русским по белому вменяется чиновникам, — а Президент, все-таки, не кто иной, самый высший чиновник, — отвечать на корреспонденцию в свой адрес в совершенно определенные сроки. Так вот, не дождавшись вразумительного ответа, Наталья Шейнюк пошла искать правды сама. Для начала — по слонимским коридорам власти. И что вы думаете, — все оказалось до смешного просто. Один заместитель председателя горисполкома (Анатолий Белянин) направил женщину к другому заму (Александру Конону), и тот-таки разобрался в проблеме посетительницы. Был вызван специалист из отдела, курирующего жилищные вопросы, и все встало на свои места.

Оказывается, семье Натальи Шейнюк чуть ли не с 1993 года положена безвозмездная субсидия на строительство или приобретение квартиры. К началу 2002 года сумма такой субсидии на одного члена семьи составляла около 800 долларов США (по курсу, конечно). Плюс к этому есть еще возможность, оказывается, взять льготный кредит в банке на недостающую для приобретения жилья сумму. Семья же у Натальи — из четырех человек. Субсидия, значит, должна быть около 3 200 долларов. Этого уже достаточно на однокомнатную квартиру...

Все было рассказано вежливо с одним только упреком: мол, зачем же было шумиху поднимать. Так ведь у нас всего приходится с боем добиваться, живем чуть ли не по законам военного времени. И в Слонимских горрайисполкомах сейчас ситуация почти фронтовая. Перед объединением многие "свое" место потерять опасаются.

Возможно, подобное стечение обстоятельств и помогло Наталье Шейнюк добиться положительного решения жилищного вопроса. Начало, во всяком случае, положено, и лед обещаний тронулся.

Валерий КОВАЛЕНКО

ХРЫШЧЭННЕ ГАСПОДНЯЕ



Фота Віталя ГІЛЯ

**19 студзеня праваслаўныя вернікі святкавалі Хрышчэнне Гасподняе альбо Вадохрышча.
У гэты дзень у цэрквах людзі выстройваліся ў вялікія чэргі да святара, каб пасвянціць ваду. Як правіла, для гэтай мэты бяруць крынічную ваду, якая сама па сабе з'яўляецца вельмі карысной для чалавека. Традыцыя ж асвячэння вады з'явілася ў нашым краі пасля 998 года, калі Уладзімір Манамах агнём і мячом ахрысціў паганскія плямёны крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў Полацкага княства.**

Мікола КАНАНОВІЧ

ЭКОНОМИКА

ИНФЛЯЦИЯ НЕ СТОИТ НА МЕСТЕ

В Беларуси продолжают увеличиваться темпы инфляции.

По данным Министерства статистики и анализа, за первую неделю января потребительские цены в стране выросли на 1,9 процента.

По итогам 2001 года потребительские цены в Беларуси возросли на 46,1 процента. В 2002 году правительство и Национальный банк прогнозируют повышение цен на 20—27 процентов.

БелаПАН

ЖЫЛЛЁ БУДЗЕ ДАРАЖАЦЬ

З пачаткам года ўзраслі тарыфы на камунальныя паслугі для насельніцтва.

За вываз смецця і тэхабслугоўванне уладальнікі двухпакаёвак заплацілі ў бягучым месяцы, у сярэднім, па пяць з паловай тысяч рублёў. У снежні мінулага года гэта сума складала каля пяці тысяч. За ацяпленне двухпакаёвай кватэры, калі там прыпісаны два чалавекі, за студзень было налічана каля 15 тысяч рублёў, у мінулым месяцы — каля 10 тысяч. А вось уладальнікі такіх кватэр, дзе ніхто не прапісаны, заплацілі ў студзені каля 35 тысяч рублёў. Раней утрыманне жылля фінансавалася ў асноўным за кошт прадпрыемстваў і мясцовых бюджэтаў. На канец 2001 года насельніцтва плаціла за камунальныя паслугі толькі каля 20% ад іх сабекошту. На працягу 2002 года гэтая лічба павінна вырасці да 50%.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПРЭМ'ЕРА

КАЗКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ДАРОСЛЫХ



Фота Віталя ГІЛЯ

Сцэна са спектакля "Залатое кураня". У ролі Кураняці — Наталля Шугай, Воўк — Аляксандр Шалахонаў

У Слонімскім беларускім драматычным тэатры адбылася прэм'ера спектакля па п'есе рускага драматурга У.Арлова "Залатое кураня". Спектакль паставіў рэжысёр Віктар Бутакоў.

Найперш хочацца адзначыць, што новая сцэнічная пастаноўка музычная. У ёй шмат песень, музыку да якіх напісаў дырэктар тэатра Мікалай Лішык.

У спектаклі толькі тры дзеючыя асобы — Ліса, Воўк і Кураня, ролі якіх выконваюць вядучыя артысты тэатра Ірына Яцук, Аляксандр Шалахонаў і Наталля Шугай. Па-майстэрску цікава і арыгінальна артысты ўвасобілі вобразы сваіх герояў. Яны запомняцца не толькі юным гледачам, але і дарослым. Наогул, дарослым таксама не пашкодзіць паглядзець прэм'еру на слонімскай сцэне. А можа яна нават больш будзе карысная бацькам, чым іх дзецям. Асабліва сёння, калі існуюць у нашых сем'ях канфлікты і праблемы паміж дарослымі і дзецьмі.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

"БЭЗ" У ЗЭЛЬВЕ

Выйшаў з друку першы нумар аніматарскага часопіса Зэльвеншчыны "Бэз".

Як сказаў карэспандэнту "ГС" рэдактар часопіса Юры Качук, пакуль плануем выдаваць "Бэз" адзін раз у квартал. А з цягам часу плануем перайсці і на штомесячнае выданне. Першы нумар часопіса Зэльвеншчыны вельмі разнастайны. Пра гісторыю Зэльвы, Дзярэчынскага Дамініканскага касцёла і Спаса-Праабражэнскую царкву расказваюць Юры Качук і Валянцін Дубатоўка.

Багаты часопіс на паэтычную творчасць. У ім змешчаны вершы Міхася Скоблы, Анатоля Валюка, Яніны Якімчык, Валянціна Дубатоўка, Ларысы Геніюш, пераклады з англамоўнай паэзіі Алены Таболіч.

Пётр Марціноўскі ў артыкуле "Помнік герою і аўтару" цікава распавядае пра свайго земляка Міхаіла Іоську — беларускага філосафа, гісторыка і педагога. У раздзеле "Мастацтва Зэльвеншчыны" прадстаўлены мясцовы мастак Васіль Шамрук.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗЛАЧЫННАСЦЬ ПАДАЕ, АЛЕ НЕ ЎСЮДЫ

Па выніках дванаццаці месяцаў 2001 года па Гродзенскай вобласці наглядаецца зніжэнне колькасці злачынстваў на 11,6% у параўнанні з 2000 годам.

Найбольшае зніжэнне, як піша газета "МВ", адзначана па Свіслацкаму раёну — на 44,8%, а найбольшы рост — па Бераставіцкаму (на 19,8%). У Слонімскім раёне злачынстваў паменшала на 19,7%, у Зэльвенскім — на 16,1%, у Мастоўскім — на 1,9%. А вось у Дзятлаўскім раёне працы ў міліцыі пабольшала. Там адзначаны рост злачыннасці на 7,6%.

Валерый КАВАЛЕНКА

НАВІНЫ

ДЗЕСЯТАЯ ШКОЛА — З ЛЬВОМ САПЕГАМ



Фота Віталя ГІЛЯ

Адам Ёрш перадае сваю карціну школьнаму музею

Музей СШ № 10 г.Слоніма папоўніўся новым экспанатам — карцінай з выявам канцлера Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі.

Карціну намаляваў слонімскі мастак Адам Ёрш і бясплатна падараваў яе школьнаму музею. Гэты музей у свой час арганізаваў настаўнік школы і паэт Янка Карповіч. Пры жыцці Янка Карповіч марыў аздобіць школьны музей партрэтамі славутых людзей Беларусі. Першым такім экспанатам і стаў вялікі партрэт Льва Сапегі.

Сяргей ЧЫГРЫН

СЛОНІМСКАЯ "ГІСТОРЫКА" АБ'ЯДНОЎВАЕЦЦА

У Слоніме адбыўся ўстаноўчы сход мясцовага аддзялення рэспубліканскага маладзёжнага аб'яднання "Гісторыка".

Адзін з актывістаў слонімскай "Гісторыкі" Зміцер Трафімовіч адзначыў, што мэтай аб'яднання маладых гісторыкаў з'яўляецца вывучэнне гісторыі Беларусі ў еўрапейскім кантэксце, прапаганда гістарычных даследаванняў і ведаў, ажыццяўленне навуковай, кансультатыўнай, метадычнай і вучэбнай дзейнасці.

Сяргей ЧЫГРЫН

БАРАНОВИЧИ

ОБРУШИЛАСЬ КРОВЛЯ ДЕТСКОГО САДА

14 января около полудня под тяжестью снежного покрова, образовавшегося на крыше детского сада в деревне Тешевле Барановичского района Брестской области, обвалился участок кровли этого строения.

Лишь по счастливой случайности никто из находившихся в здании детского сада детей и обслуживающего персонала не пострадал. Кровля слетела с прогнивших стропил и обрушилась на расположенное чуть ниже перекрытие. Благодаря тому, что перекрытие устояло под тяжестью кровли и находившегося на ней снега, 11 детей и трое воспитателей отделались лишь легким испугом. Теперь детский сад будет закрыт и его воспитанников на время ремонта примет соседний детсад.

Дмитрий БЕЛЬСКИЙ

ГРОДНО

ОТКЛЮЧИЛИ ЗА ДОЛГИ

Минэнерго Беларуси распорядилось прекратить отпуск электроэнергии ряду предприятий.

С 18 января до уровня аварийной брони от сетей энергоснабжения отключены гродненские комбинат строительных материалов, предприятие "Гродножилстрой", ОАО "Радиотехника", "Гроднитекс" и "Лакокраска", лидские заводы электроизделий, "Оптик", опытный завод "Неман" (Лида), а также гродненский завод "БелТАПАЗ" и некоторые другие предприятия региона. Эти санкции будут сняты с них лишь после оплаты или получения гарантийных писем по оплате от должностных лиц отраслевых министерств. При этом ответственность за последствия, связанные с ограничением или полным прекращением отпуска энергоресурсов, возлагается на руководителей предприятий, допустивших задолженность по оплате потребленных энергоресурсов, и на должностных лиц отраслевых министерств, которые гарантировали оплату.

Наталья КУЛАГИНА

СУДЬБОЙ «ПАГОНІ» ОБЕСПОКОЕНЫ В РОССИИ

Российский ПЕН-центр выразил обеспокоенность судьбой редактора белорусской негосударственной газеты "Пагоня" (Гродно) Николая Маркевича и журналиста Павла Можейко.


"Пагоня" была закрыта по решению Высшего хозяйственного суда Беларуси в ноябре прошлого года. Основанием для этого стала публикация в газете материалов, которые, по мнению представителей прокуратуры, содержали клевету в отношении президента Александра Лукашенко. В отношении Николая Маркевича и Павла Можейко возбуждено уголовное дело, по которому журналистов могут лишить свободы на срок до пяти лет.

Известные российские писатели Андрей Битов, Андрей Вознесенский, Фазиль Искандер, Лев Тимофеев, Феликс Светов, Юнна Мориц и Александр Ткаченко обратились с открытым письмом к президенту Беларуси. "Мы считаем, – пишут они, – что в данной ситуации было нарушено право журналистов на свободное выражение своего мнения, гарантированное статьей 19 Всеобщей декларации прав человека, и они преследуются за свою профессиональную деятельность". Писатели призвали Лукашенко выступить в роли гаранта Конституции Республики Беларусь и Декларации прав человека, "использовать всю свою власть и полномочия для отмены решения о закрытии газеты "Пагоня" и прекращения преследований журналистов Николая Маркевича и Павла Можейко".

Геннадий БАРБАРИЧ

ПРОШУ СЛОВА

РУИНЫ СТРЕЛЯЮТ В УПОР



Фота Віталя ГІЛЯ

Так сегодня выглядит здание слонимского театра на площади Ленина

Мне захотелось поделиться своими пожеланиями и предложениями, как нам всем жить лучше.

Война давно закончилась, а в центре Слонима стоят руины, к которым все давно привыкли – будущее здание театра как декорация к следующему фильму. Государство наше небогатое и вряд ли нам построит здание театра. Пора думать самим, чтобы не было стыдно детям объяснять, что эти стены когда-то будут театром. Не по-хозяйски обсуждать, где поставить памятник Л. Сапеге, когда в центре города уже стоит памятник нашему равнодушию и лени.

Предлагаю или загадываю желание увидеть в газете макет будущего здания театра и его сметную стоимость. Далее горисполком объявит конкурс для строителей, кто возьмется построить дешевле, но так, чтобы плиты перекрытий не падали. Может быть, соберется Общественный Попечительский Совет, состоящий из директора театра, архитектора, строителя-прораба, исполкомовской власти, корреспондентов двух слонимских газет, а также представителей политических объединений и партий, белорусской патриотической молодежи и "не патриотической". Проще стоять с плакатами и писать на стенах, тяжелее – конкретно работать. Совет должен организовывать лотереи, доход от которых пойдёт на строительство театра, собирать пожертвования. Не призываю актеров театра плясать на рынке под гармошку, но установить в гастрономе "Спутник" опломбированную стеклянную кубышку с надписью: "Для храма культуры" можно было бы. Совет должен организовывать субботники и воскресники для желающих помочь строителям. Каждый, считающий себя культурным, мог бы хоть десять дней поработать безвозмездно... Верующие в Бога скоро достроят храм, а верующих в культуру у нас что – нет?

Совет должен собирать пожертвованные строительные материалы от организаций и частных лиц. Я готов хоть автобусом привезти с десяток кирпичей для театра, если стройплощадка будет огорожена и там будет сторож. Можно нанять грузовик для сбора стройматериалов по городу, украсить его надписью "для театра", а потом его фотографию выслать Министру культуры – пусть в Минске перенимают опыт. Совет может предложить купить будущие метры здания театра предпринимателям для торговли книгами или для открытия там буфета. Совет может напечатать именные билеты для посещения театра на 5-10 лет. Эти билеты выкупать можно было бы в течение года путем уплаты взносов. Списки пожертвовавших и отчет о потраченных деньгах Совет должен сообщать в газету или на стенд возле строящегося здания театра. Состоящие в Попечительском Совете денег за это не получают, но их фотографии потом должны быть в фойе здания театра.

Мясокомбинат, хлебозавод да винзавод могли бы обеспечить бутербродами добровольцев, работающих бесплатно на строительстве здания театра. Поможем всем городом построить театр, или нам слабо? Нам повезло, что наш Слоним не посетил М. Задорнов и не написал монолога "Я не понимаю, как можно жить с руинами в центре города...".

Станислав ОЛЬХОВИК

ДЗЯТЛАВА

КУДЫ ЗНІКАЕ ДЫЗЕЛЬНАЕ ПАЛІВА НА ДЗЯТЛАЎШЧЫНЕ?


У калгасах і саўгасах Дзятлаўшчыны, як і ва ўсіх іншых раёнах Беларусі, з кожным годам становіцца менш сельскагаспадарчай тэхнікі. А вось колькасць прыватных трактароў і легкавых аўтамашын павялічваецца.

На сённяшні дзень у Дзятлаўскім раёне зарэгістравана 127 прыватных трактароў. Акрамя гэтага, у сельскіх жыхароў ёсць шмат і не зарэгістраванай тэхнікі. Па меркаванню спецыялістаў, адзін прыватны трактар у сярэднім расходуе ў год 1200 літраў дызельнага паліва.

У тым жа Дзятлаўскім раёне зарэгістравана 4612 прыватных легкавых аўтамабіляў, з іх больш за 1500 аўтамабіляў з дызельнымі рухавікамі. Заправіць прыватныя дызельныя аўтамабілі і трактары можна на 6 запраўчных станцыях, дзе за 11 месяцаў мінулага года было прададзена за наяўны разлік толькі 238 тон дызельнага паліва. Паўстае пытанне: дзе жыхары Дзятлаўшчыны запраўляюць дызельным палівам свае прыватныя трактары і аўтамабілі?

Здагадацца тут не вельмі цяжка, калі ўлічыць, што ў 2000 годзе і за дзесяць месяцаў мінулага года супрацоўнікамі Дзятлаўскага РАУС за крадзеж ГЗМ складзена 30 адміністрацыйных пратаколаў, узбуджана тры крымінальныя справы.

Асноўнымі прычынамі крадзяжу гаруча-змазачных матэрыялаў на Дзятлаўшчыне з'яўляецца найперш тое, што немагчыма законна па месцу жыхарства купіць паліва.



Фота IREX/ProMedia

Плюс да гэтага – дрэннае абсталяванне складоў, дзе яно захоўваецца, а таксама нездавальняючы стан першаснага бухгалтарскага ўліку нафтапрадуктаў.

Нядаўна спецыялісты Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці зацікавіліся і праверылі, як расходуюць ГЗМ на Дзятлаўшчыне. У выніку праверкі і ўзнікла шэраг вышэй названых праблем. Таму за нерацыянальнае выкарыстанне паліва да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты некаторыя службовыя асобы.

Сяргей ЧЫГРЫН

ИВАЦЕВИЧИ

РТУТЬ БЫЛА В САНАТОРИИ

Пять килограммов ртути вывезли спасатели из санатория "Сосновый Бор", расположенного в поселке Сосновый Ивацевичского района Брестской области.

Опасный металл был обнаружен в подвальном помещении действующей при санатории средней школы, в которой занимаются отдыхающие в "Сосновом Бору" ученики. О происшествии в санатории сообщили в Ивацевичский райотдел по чрезвычайным ситуациям.

Через несколько минут трое спасателей уже работали на месте, а из расположенных над школьным подвалом спортзала и нескольких учебных помещений были эвакуированы 43 ученика и пятеро взрослых — преподаватели и медицинские работники.

В подвале спасатели обнаружили прибор, из которого вытекала ртуть. Им оказалось устройство для определения давления газа. Никто из обслуживающего персонала и администрации санатория так и не смог объяснить, каким образом прибор оказался в подвале.

Общее количество вытекшей ртути составило около 5 килограммов. Это одна из самых крупных находок жидкого металла за последние годы. Кстати, за весь прошлый год подразделения МЧС собрали 124 килограмма ртути.

Дмитрий БЕЛЬСКИЙ

МАСТЫ

ЭКСПЕРЫМЕНТ ЗАЦЯГНУЎСЯ

Дзіўны паварот займела следчая справа начальніка Мастоўскага камітэта рыбаахоvы Алега Серады, які разам з іншымі мужчынамі быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі за бракан'ерства падчас нерасту, калі лоўля забаронена. Гэтым разам следства спатыкнулася аб звычайны аер.

Справа вось у чым. Яшчэ ўлетку праходзіў следчы эксперымент, падчас якога следчыя павінны былі ўстанавіць: ці сапраўды сведкі маглі разглядзець, што іменна Алег Серада са сваімі памочнікамі займаўся незаконнай лоўляй рыбы. Паколькі ў гэты час на затоцы выраслі асака, аер і іншая трава, то прысутныя палічылі: яна перашкаджае чысціні эсперыменту. Зараз справа зноў адкладзена. Чарговы эксперымент павінен адбыцца вясною.

ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ

На сённяшні дзень у Мастоўскім раёне налічваецца 400 прадпрымальнікаў.

Лічба ўстойлівая на працягу апошніх трох гадоў. Штогод некалькі дзесяткаў прадпрымальнікаў спыняюць сваю дзейнасць, але на іх месца прыходзяць новыя.

У ГАЛУБАХ СЕЛІ НА КАНЯ

Прайшоў традыцыйны штогадовы ўлік хатняй жывёлы ў вяскоўцаў.

Як высвятляецца, самая вялікая колькасць коней у жыхароў Галубоўскага сельсавета — 123. Іншыя адстаюць ад яго і значна. Прыкладам, у Мастоўскім — 13 коней, Пацавіцкім — 20, Харціцкім — толькі 5 галоў цяглавай сілы. Такая колькасць коней у прыватным сектары Галубоўскага сельсавета тлумачыцца тым, што пры расфармаванні калгаса "Чырвоны партызан" вяскоўцам далі магчымасць выкупіць іх за нязначны кошт.

ЯМЫ ЗАКОПВАЦЬ НЕ ХОЧУЦЬ

Мастоўскія камунальнікі ніяк не хочуць закопваць яму, якая засталася пасля рамонту цеплясетак ля самага ўвахода ў будынак суда.

Не зрабілі яны гэтага нават пасля таго, як супрацоўнікі Мастоўскага ДАІ вынеслі пісьмовае папярэджанне. Толькі праз два дні пасля заканчэння тэрміну тры рабочыя неахвотна ўвіхаліся з рыдлёўкамі. На сённяшні дзень вялізныя ямы засталіся па вуліцы Лермантава і праспекце Юнацтва. Апошняя мае даўжыню амаль дзвесце метраў. Гэты ўчастак цеплатрасы быў раскапаны два гады назад і вясной мінулага года збольшага прысыпаны.

СТАРШЫНЯ СТАЎ УЛАСНІКАМ

Міхаіл Вартанян выкупіў кааператыў "Садовы", дзе знаходзіцца адзіны на Мастоўшчыне вінзавод. У свой час гэты завод належаў саўгасу "Лаўна", які пазней аб'яднаўся з саўгасам "Чарлёна".

У гады Савецкага Саюза, падчас перабудовы праца завода была прыпынена, абсталяванне сапсавана, а сад, які належаў гаспадарцы, выкарчаваны. Шмат сіл давялося прыкласці Міхаілу Вартаняну, каб аднавіць працу завода. Доўгі час ён арэндаваў абсталяванне, а зараз стаў яго ўладальнікам.

ПЕНСІЯНЕРАМ – ДРОБЯЗЬ

Штомесячна на выплату пенсій у Мастоўскім раёне зараз патрабуецца 825 мільёнаў рублёў.

Паколькі ў горадзе і раёне налічваецца 13386 пенсіянераў, то лічба сярэдняй пенсіі складае 61631 рубель. Але і такія грошы не кожны працоўны можа прынесці.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЛУКАШЕНКО ПОРУЧИЛ РАССМОТРЕТЬ ВОПРОС ОБ АМНИСТИИ



Александр Лукашенко поручил министру внутренних дел Владимиру Наумову "тщательно проанализировать вопрос о целесообразности и обоснованности проведения в стране амнистии".

Об этом сообщила в интервью Белорусскому телевидению пресс-секретарь главы государства Наталья Петкевич.

По ее словам, введение с 1 января прошлого года новых Уголовного и Уголовно-процессуального кодексов "ознаменовало собой существенную либерализацию уголовного законодательства в стране". "В связи с произошедшими социально-экономическими преобразованиями отдельные противоправные деяния перестали признаваться преступлениями, поскольку утратили общественную опасность, другие преступления стали признаваться менее тяжкими. (...) Введение в действие новых кодексов обусловило пересмотр 25 тысяч приговоров в отношении осужденных к лишению свободы. В прошлом году в результате такого пересмотра были освобождены от дальнейшего отбывания наказания в местах лишения свободы около 4,5 тысяч человек. (...) Освобождение этих лиц не повлияло на криминогенную обстановку в республике", – сообщила Петкевич. По словам пресс-секретаря, поручая Наумову рассмотреть вопрос об амнистии, Лукашенко "высказал свое жесткое требование о том, что амнистия может быть распространена только на лиц, чье поведение не представляет и не будет представлять после освобождения опасности для государства и общества".

Наталья Петкевич прокомментировала также арест генерального директора Минского тракторного завода Михаила Леонова. "Факт возбуждения уголовного дела и задержания генерального директора (...) действительно широко обсуждается в средствах массовой информации. Это не случайно, поскольку это крупнейшее предприятие страны, и, естественно, оно находится в поле пристального внимания главы государства. Глава государства высказывает свое непреклонное и непреложное требование о том, что компетентные государственные органы должны прилагать все усилия для пресечения любых проявлений коррупции и всяких фактов экономических правонарушений, особенно со стороны должностных лиц. Не надо спекулировать на такой позиции главы государства, она не случайна, поскольку борьба с коррупцией – это основополагающее положение предвыборной программы президента как в 1994-м, так и в 2001 году", – сказала Петкевич.

Дмитрий ВЛАСОВ

ФИНАНСЫ

НОВЫЕ ПРАВИЛА ОРГАНИЗАЦИИ КАССОВОЙ РАБОТЫ

Правление Национального банка утвердило Правила организации кассовой работы в банках Республики Беларусь.

Как сообщили БелаПАН в управлении информации Нацбанка, в новых правилах дополнены и отредактированы отдельные положения о материальной ответственности кассиров, о формировании денежной наличности, в том числе, иностранной валюты, о порядке выдачи кассирами банкнот из касс банка и другие моменты.

Необходимые изменения внесены также в связи с тем, что белорусское законодательство предоставляет предпринимателям право сдавать денежную выручку через аппарат инкассации. Кроме того, по просьбе банков унифицированы приходные и расходные внебалансовые ордера для оформления кассовых операций, как в белорусских рублях, так и в иностранной валюте.

Алексей ОРЕШКО

КРИМИНАЛ

ЛЮДИ ГИБНУТ ЗА МЕТАЛЛ

В 2001 году в Беларуси зафиксировано около 500 случаев хищения проводов линий электропередач и оборудования трансформаторных подстанций. Сумма ущерба составила 624 млн. рублей.

За год похищено 130 тонн алюминиевого провода, 39 трансформаторов, 23 опоры линий электропередач. Похищались также счетчики электрической энергии, автоматические выключатели и прочее. При этом сумма возмещенного ущерба не превысила 1,3 млн. рублей, или 0,2 процента от суммы потерь. По информации пресс-службы, это связано "с низкой раскрываемостью хищений и, как следствие, безнаказанностью расхитителей, которые зачастую подвергают свою жизнь смертельной опасности". В 2001 году во время совершения противоправных действий пять человек погибли и двое получили сильные ожоги.

БелаПАН

РОССИЯ НАЧИНАЕТ ПРИВАТИЗАЦИЮ БЕЛОРУССКИХ ПРЕДПРИЯТИЙ

Российские инвесторы будут участвовать в приватизации белорусских предприятий на общих основаниях.

Об этом шла речь во время встречи заместителя министра имущественных отношений России Владимира Мамигонова в Департаменте по управлению государственным имуществом при Минэкономики Беларуси, сообщает ИА «Экопресс».

ХАРТИЯ–97

ПАПА РИМСКИЙ ПЛАНИРУЕТ ПОСЕТИТЬ БЕЛАРУСЬ В 2002 ГОДУ

Официальные лица Ватикана обсуждают возможность поездки Папы Иоанна Павла–II в Беларусь в 2002 году, сообщает агентство Ассошиэйтед Пресс.

В мае Папа посетит Болгарию, через неделю после своего 82-летия. Визит в Болгарию станет очередным шагом Ватикана, направленным на улучшение отношений с Православной церковью. Ватикан надеется, что данный визит поспособствует организации аналогичного визита в Россию, которого в Риме так ждут.

Хартия–97

БЕЛОРУССКИЕ ПРОДУКТЫ ПИТАНИЯ НЕ СООТВЕТСТВУЮТ СТАНДАРТАМ

В минувшем году более 3700 субъектов хозяйствования, занимающихся производством и реализацией продуктов питания, были проверены органами государственного надзора.

Нарушения установлены на 2600 предприятиях. Такие данные привел на заседании "круглого стола" в Общественном пресс-центре столичного Дома прессы начальник отдела государственного надзора за стандартами Комитета по стандартизации, метрологии и сертификации Виктор Нарыгин. По его словам, к нарушителям, которые реализовывали некачественную продукцию, применены экономические санкции. Их сумма составила более 486 миллионов рублей.

ХАРТИЯ–97

РАЗРАБОТАЛИ НОВУЮ КОБУРУ

В Беларуси производится самая "быстрая" в мире кобура. Она разработана коллективом специалистов Национального дизайн-центра, Академии МВД и объединения "Интеллектуальный ресурс".

Кобура предназначена для пистолета Макарова (ПМ), наиболее распространенного на территории СНГ. Если штатная советская ("наркомовская") кобура под ПМ требует для своего открывания 1,20 секунды, а лучшая американская кобура фирмы "Бианчи Интернэшнл" с "быстрой кнопкой" – 0,60 секунды, то блиц-кобура (БК или "белорусская конструкция") – всего 0,02 секунды. То есть, она "быстрее" американской в 30 раз.

Экономия времени за счет устранения его потерь при извлечении короткоствольного оружия имеет важное, а порой – буквально жизненное значение, так как позволяет опередить противника в момент открытия огня и в итоге – выжить при внезапном столкновении, отмечают специалисты. Это обстоятельство очень важно для сотрудников правоохранительных органов, бойцов антитеррористических подразделений, войсковых разведчиков, телохранителей.

Виктор РУДНОВ

ПРОМЫШЛЕННИКИ ОЖИДАЮТ УХУДШЕНИЯ СОСТОЯНИЯ СВОИХ ПРЕДПРИЯТИЙ

В октябре минувшего года 47 процентов руководителей промышленных предприятий Беларуси считали, что в ближайшие два-три месяца экономическое положение их предприятий ухудшится. 42 процента рассчитывали на сохранение ситуации, и лишь 11 процентов ожидали улучшения.

Таковы результаты анкетного опроса, который провели в октябре 2001 года ученые Научно-исследовательского экономического института Министерства экономики Беларуси. Участие в нем приняли 187 руководителей промышленных предприятий страны.

В аналогичном опросе, который проводился в апреле прошлого года, ухудшения экономического положения своих предприятий ожидали 34 процента респондентов. Около половины – 46 процентов – рассчитывали на стабильность; и 16 процентов – на улучшение ситуации. Таким образом, налицо тенденция к ухудшению экономического положения промышленных предприятий Беларуси.

В числе основных причин, сдерживающих производство, респонденты отметили недостаток оборотных средств – 79 процентов, неплатежи потребителей – 73 процента, низкий платежеспособный спрос – 71 процент, налоговую политику государства – 59 процентов, а также высокие цены на сырье и материалы – 55 процентов. 8 процентов руководителей-промышленников отметили нехватку квалифицированных кадров.

Леонид ИГНАТЬЕВ

У НАС БУДЕТ НОВЫЙ ГИМН

Условия конкурса на слова и музыку нового белорусского гимна рассмотрены на первом заседании рабочей комиссии под руководством вице-премьера Владимира Дражина.

До 1 апреля общественные организации, творческие союзы и обычные граждане могут представлять в комиссию свои варианты. Пять лучших будут записаны духовым оркестром. Затем останется три произведения, из которых будет выбрано лучшее. Новый белорусский гимн должен впервые прозвучать в День независимости, 3 июля. В ближайшее время Совет Министров утвердит положение о конкурсе.

В интервью Белорусскому телевидению министр культуры Леонид Гуляко не исключил, что музыка гимна останется прежней, а слова будут новые.

В свое время так был принят нынешний российский гимн: на музыку гимна СССР наложили более "современные" стихи.

БелаПАН

ОБЩЕСТВО

ВОССТАНОВИЛИ МЕМОРИАЛ



Фото IREX/ProMedia

В Куропатах состоялась церемония открытия (после восстановления) мемориальной скамьи, установленной 15 января 1994 года президентом США Биллом Клинтоном и уничтоженной неизвестными вандалами летом 2001 года.

Мемориальную скамью реставрировал ее автор, известный белорусский скульптор Алесь Шатерник. На скамью, в том месте, где она была разломана пополам, а затем восстановлена, скульптор положил бронзовый венок, а рядом установил плиту с текстом на белорусском и английском языках: "Гэты мемарыяльны знак быў падараваны беларускаму народу прэзідэнтам Злучаных Штатаў Амерыкі Уільямам Джэферсанам Клінтанам 15 студзеня 1994 года.

